*18.* Государственный зональный архив в г. Новогрудок. – Ф. 347. Оп. 1. Д. 45. Протоколы заседаний, решения исполкома и материалы к ним за 1949 г. Протоколы № 35–37 (6.12.1949–30.12.1949).

*19.* Государственный зональный архив в г. Новогрудок. – Ф. 347. Оп. 1. Д. 51. Протоколы заседаний, решения исполкома и материалы к ним за 1950 г. (15.05.1950–7.06.1950).

*20.* Государственный зональный архив в г. Новогрудок. – Ф. 347. Оп. 1. Д. 52. Протоколы заседаний, решения исполкома и материалы к ним за 1950 г. (19.06.1950–20.07.1950).

*21.* Государственный зональный архив в г. Новогрудок. – Ф. 347. Оп. 1. Д. 53. Протоколы заседаний, решения исполкома и материалы к ним за 1950 г. (29.07.1950–29.08.1950).

*22.* Государственный зональный архив в г. Новогрудок. – Ф. 347. Оп. 1. Д. 60. Протоколы заседаний, решения исполкома и материалы к ним за 1951 г. (10.02.1951–9.03.1951).

*23.* Государственный зональный архив в г. Новогрудок. – Ф. 347. Оп. 1. Д. 85. Протоколы заседаний, решения исполкома и материалы к ним за 1953 г. (29.04.1953–29.05.1953).

*24.* Государственный зональный архив в г. Новогрудок. – Ф. 347. Оп. 1. Д. 86. Протоколы заседаний, решения исполкома и материалы к ним за 1953 г. (8.06.1953–13.07.1953).

*25.* Государственный зональный архив в г. Новогрудок. – Ф. 347. Оп. 1. Д. 87. Протоколы заседаний, решения исполкома и материалы к ним за 1953 г. (22.07.1953–28.08.1953).

*26.* Государственный зональный архив в г. Новогрудок. – Ф. 347. Оп. 1. Д. 122. Протоколы заседаний, решения исполкома и материалы к ним за 1956 г. (30.05.1956–26.07.1956).

*27.* Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Карэліцкага р-на. – Мінск : Ураджай, 2000. – 645 с.; іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ МУЗЕІ ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ ТУРЫСТЫЧНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ РЭГІЁНАЎ

***М. І. Плаўская,***
*саіскальнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Музеі адыгрываюць вялікую ролю ў грамадскім, культурным, эканамічным жыцці рэгіёнаў. Гэта некамерцыйныя ўстановы, але яны здольныя прыносіць населенаму пункту, дзе знаходзяцца, карысць і эканамічную выгоду. Гэта звязана з тым, што многія з іх сёння ўключаны ў турыстычныя і культурныя маршруты.

Вядомы пісьменнік, журналіст, вандроўнік Пётр Вагіль лічыць: «Сувязь чалавека з месцам яго пражывання – загадкавая, але відавочная. Загадвае ёй «geniusloci», геній месца, які звязвае інтэлектуальныя, духоўныя, эмацыйныя з'явы з іх матэрыяльным асяроддзем» [3, с. 150]. Менавіта такім «геніям месца» прысвячаюцца літаратурна-мемарыяльныя музеі, якія, у сваю чаргу, становяцца культурнымі і турыстычнымі цэнтрамі рэгіёнаў.

Тэма ролі і месца музеяў у турыстычным сектары не новая, але актуальная з-за імклівага развіцця ўнутранага і знешняга турызму. Турысты праяўляюць вялікую зацікаўленасць гісторыяй, культурай, літаратурай рэгіёна, які яны наведваюць. Гэта значыць, што гісторыка-культурная спадчына адыгрывае важную ролю ў распрацоўцы турыстычных маршрутаў. Музеі па праве можна лічыць галоўнымі захавальнікамі і інтэрпрэтатарамі багатай культурнай спадчыны. Прасоўванне музеяў у якасці турыстычных славутасцей месцаў і дэсцінацый прадстаўляе сабой важную задачу развіцця турызму [5, с. 173].

Многія рэгіёны ганарацца сваёй сувяззю з той ці іншай вядомай асобай у галіне літаратуры, а таксама музеямі, якія былі створаны дзеля ўвекавечання іх памяці. Пры гэтым яны з'яўляюцца выразнікамі нацыянальнай культуры, якая ў рэгіёне мае спецыфічныя адметнасці.

Літаратурна-мемарыяльныя музеі ў рэгіёнах сёння могуць разглядацца ў двух аспектах:

– культурны цэнтр;

– турыстычны цэнтр.

На сённяшні дзень большасць літаратурна-мемарыяльных музеяў знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. Як правіла, гэта сядзібы, дачы, дамы вядомых літаратурных дзеячаў. У асноўным літаратурна-мемарыяльныя музеі з'яўляюцца філіяламі буйных літаратурных музеяў, якія знаходзяцца ў Мінску. Менавіта размяшчэнне ў сельскай мясцовасці надае музеям пэўную спецыфіку, якая адлюстроўваецца на іх дзейнасці. Аддаленасць ад галаўных музеяў і буйных гарадоў, цесны кантакт з жыццядзейнасцю мясцовага насельніцтва прадугледжваюць актыўнае ўзаемадзеянне з мясцовымі ўладамі і іншымі сацыяльнымі інстытутамі рэгіёна. Часам правінцыяльныя музеі выступаюць у якасці культурнай дамінанты, адзінага сацыякультурнага цэнтра населенага пункта і нават могуць садзейнічаць вызначэнню накіраванасці развіцця рэгіёна [1, с. 52–59].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівая ўвага ў рэгіянальных літаратурна-мемарыяльных музеях надаецца культурна-адукацыйнай дзейнасці.

Трэба адзначыць, што мясцовы музей можа стаць сапраўдным цэнтрам культуры толькі ў выпадку, калі асаблівая ўвага надаецца рабоце з мясцовым насельніцтвам рознага ўзросту. Напрыклад, у філіяле Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы – Купалаўскім мемарыяльным запаведніку «Вязынка» праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы па тэматыцы народных святаў, якія прыцягваюць увагу насельніцтва розных узростаў, таксама кожны год праводзіцца свята паэзіі, песні і народных рамёстваў «З адною думкаю аб шчасці Беларусі» сумесна з Маладзечанскім аблвыканкамам, якое збірае гасцей з усёй Беларусі і краін замежжа. Літаратурна-мемарыяльны музей Кузьмы Чорнага ў Цімкавічах праводзіць музейна-педагагічныя заняткі «Ганарыся сваім земляком і ведай пра яго».

Як адзначае даследчыца А. Масцяніца, правядзенне разнастайных акцый, нават не звязаных з профілем музея, у рэгіянальных (і не толькі) літаратурна-мемарыяльных музеях апраўдана. Гэта дазваляе ўдзельнікам такіх мерапрыемстваў пабываць у сценах музея, такім чынам, зацікавіцца яго калекцыямі і экспазіцыяй. Для музея важна стаць для мясцовых жыхароў месцам правядзення вольнага часу і, такім чынам, заняць значнае месца ў культурным жыцці рэгіёна [2, с. 151].

Трэба адзначыць, што якасць функцыянавання рэгіянальных літаратурна-мемарыяльных музеяў у многім залежыць ад асабістай пазіцыі іх супрацоўнікаў, гэта значыць мае выразны персаніфікаваны характар. Часам менавіта пазіцыя кіраўніка і супрацоўніка філіяла вызначае дынаміку, інтэнсіўнасць і поліфункцыянальнасць дзейнасці музея [1, с. 52–59].

Другім важным напрамкам дзейнасці рэгіянальных літаратурна-мемарыяльных музеяў з’яўляецца іх развіццё ў якасці своеасаблівых турыстычных цэнтраў. На сённяшні дзень культурны турызм з’яўляецца даволі запатрабаваным. Яго асноўная мэта – знаёмства з культурным асяроддзем месца наведвання. Ён можа ўключаць наведванне аб’ектаў культурнай спадчыны, кантакты з культурнымі жыхарамі. Трэба адзначыць, што сёння ён нараўне з камплектаваннем, аховай культурных каштоўнасцей, становіцца паўнавартаснай формай музейнай работы.

Павышэнне турыстычных патокаў прыводзіць да павышэння спросу на музеі. Літаратурна-мемарыяльныя музеі даволі часта становяцца месцам паломніцтва прыхільнікаў творчасці вядомых асоб. Побач з вялікімі, нацыянальнага значэння музеямі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

важным з’яўляецца больш шырокае ўключэнне невялікіх музеяў у турыстычны прадукт. Літаратурна-мемарыяльныя музеі А. Міцкевіча ў Завоссі і Навагрудку, Ф. Багушэвіча ў Кушлянах, Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка», мемарыяльны запаведнік «Ляўкі» і многія іншыя арганічна ўключаюцца ў турыстычныя маршруты [4, с. 86–90].

Аднак дзеля таго каб музеі былі прывабныя для турыстаў, яны павінны правесці вялікую падрыхтоўчую работу. На сённяшні дзень ідзе паступовае абнаўленне экспазіцый рэгіянальных літаратурна-мемарыяльных музеяў, многія з якіх дагэтуль былі састарэлыя. Музеі сёння адказваюць за паказ і інтэрпрэтацыю калекцый ў «дасціпнай» форме для наведвальнікаў усіх катэгорый, у тым ліку і для іншаземцаў. Жаданне турыстаў вывучаць культуру краіны наведвання прыводзіць іх у музей, які з’яўляецца крыніцай найбольш поўнай інфармацыі пра культуру месцазнаходжання.

Павелічэнне колькасці турыстаў абавязвае музеі развівацца і прымяняць разнастайныя формы работы з наведвальнікам. Тут можна адзначыць узнікненне зваротных ўзаемасувязяў: цікавыя, «якасныя» музеі становяцца прычынай наведвання таго ці іншага рэгіёна, горада, што вядзе да станоўчага ўплыву на развіццё турызму, і, у сваю чаргу, рэгіёна.

---


1. *Лупашка, І. Г.* Рэгіянальныя музеі як культурныя і турыстычныя цэнтры (на прыкладзе рэгіянальных філіялаў літаратурных музеяў) / І. Г. Лупашка // IV Тышкевіцкія чытанні (г. Валожын, 24 кастр. 2012 г.) : матэрыялы чытанняў / рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 52–59.

2. *Мастеница, Е. Н.* Региональный компонент деятельности современного музея / Е. Н. Мастеница // Важский край: источниковедение, история, культура. – Вельск, 2004. – Вып. 2. – С. 151.

3. *Никулина, С. П.* Экскурсионный маршрут «Гении родных мест» / С. П. Никулина, Е. А. Шокова // Музей и проблемы культурного туризма : материалы XVI круглого стола в Государственном Эрмитаже, Санкт-Петербург, 5-6 апр. 2018 г. / Изд-во Государственного Эрмитажа ; ред. Л. А. Зорина. – СПб. – С. 150.

4. *Потаева, Г. Р.* Музейные учреждения в современном туристическом продукте Беларуси / Галина Ромуальдовна Потаева // Первый Национальный форум «Музеи Беларуси» (Гродно, 12–14 окт. 2012 г.) : сб. материалов деловой программы / Ин-т культуры Беларуси. – Минск, 2013. – С. 86–90.

5. *Салтыкова, Т. В.* Региональный музей в системе внутреннего туризма: вызовы и проблемы / Т. В. Салтыкова // Музей и проблемы




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурного туризма : материалы XVI круглого стола в Государственном Эрмитаже, Санкт-Петербург, 5–6 апр. 2018 г. / Изд-во Государственного Эрмитажа ; редактор Л. А. Зорина. – СПб. – С. 173.

# РЕКОНСТРУКЦИЯ ПАРАДНЫХ ДОСПЕХОВ В БЕЛАРУСИ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ

***Т. Н. Полунин,***
*аспирант Белорусского государственного университета культуры и искусств*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Интерес к реконструкции артефактов средневековой культуры, возникший в конце XX в. в современной Беларуси, породил ряд исторических клубов различной тематики. Первым военно-историческим объединением, организованным в 1994 г. Дмитрием Нестюком и занимающимся реконструкцией доспехов и вооружения, является военно-историческое объединение «Орден Сердца Дракона», впоследствии переименованное в «Орден северного Храма». Основной тематикой клуба является реконструкция вооружения и снаряжения Ордена Бедных Рыцарей Храма Соломонова (Тамплиеров) второй половины XIII – начале XIV в. Военно-историческое объединение «Орден северного Храма» является организатором и соорганизатором многочисленных фестивалей, турниров, исторических игр в Беларуси и за рубежом.

Большую роль в популяризации рыцарской культуры в Беларуси, сыграл военно-исторический клуб «Княжий Гуф», основанный в 1999 г. Федором Михеевым. Члены клуба первыми в Беларуси воссоздали метательные машины. На протяжении нескольких лет военно-историческим клубом «Княжий Гуф» были проведены выставки доспехов и оружия «Рыцары Вялікага Княства», которые проходили в Национальном историческом музее Республики Беларусь (г. Минск), в музеях Заславля, Молодечно, Мира и других городах Беларуси [2].

К началу XXI в. в Республике Беларусь было основано более двадцати военно-исторических клубов. Так, в 2004 г. инженер Виктор Шевцов и скульптор Константин Дударев основали в Минске художественную мастерскую «Стальное наследие», специализирующуюся на создании реконструкций европейских боевых и парадных доспехов. Основной акцент художественной мастерской был сделан на максимальное историческое